Весці БДПУ. Серыя 1. 2024. № 2. С. 143–147

*УДК 821.161.3*

# МАСТАЦКІЯ СРОДКІ РЭАЛІЗАЦЫІ АПАЗІЦЫІ ЖЫЦЦЯ І СМЕРЦІ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА «ЗНАК БЯДЫ»

**М. В. Яромка,**
*магістрант кафедры замежнай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ*

*UDC 821.161.3*

# ARTISTIC MEANS FOR THE REALISATION OF THE LIFE AND DEATH OPPOSITION IN VASIL BYKAŬ'S NOVELLA «SIGN OF MISFORTUNE»

**M. Yaromka,**
*MA student at the Department of Foreign Literature of the Faculty of Philology, BSU*

Паступіў у рэдакцыю 15.04.2024.

Received on 15.04.2024.

Апазіцыя жыцця і смерці ў аповесці В. Быкава «Знак бяды» раскрываецца на трох узроўнях: сюжэтным – праз дыялектыку працэсуальнага і выніковага ўспрымання персанажамі ўласнага жыцця ў рамках супрацьпастаўлення жыцця і лёсу; прасторавым – пры дапамозе антытэзы мікра- і макрасвету, рэалізаванай праз узаемадзеянне чалавека і прыроды, апазіцыю «свой – чужы»; часавым – праз камбінаванне лінейнай і цыклічнай канцэпцый часу.

*Ключавыя словы*: бінарная апазіцыя, Васіль Быкаў, «Знак бяды», структурна-семіятычны метад, хранатоп.

The life and death opposition in Vasil Bykaŭ's novella «Sign of Misfortune» is developed on the three levels: the plot level – by the dialectics of characters' process and result oriented perception of their own life within the frame of the life and fate opposition; the space level – by the antithesis of micro and macro-world expressed through the interaction between human and nature as well as through the opposition of «own – alien»; the temporal level – by the combination of linear and cyclic time concepts.

*Keywords:* binary opposition, chronotope, «Sign of Misfortune», structural-semiotic method, Vasil Bykaŭ.

Васіль Быкаў (1924–2003) – адзін з найвядомейшых беларускіх празаікаў XX ст., чые творы закранаюць як нацыянальныя, так і агульначалавечыя праблемы. Аповесць «Знак бяды» (1982) прысвечана трагічным падзеям Другой сусветнай вайны і даваеннага перыяду, якія раскрываюцца праз лёс сялян.

У беларускім літаратуразнаўстве творчасць В. Быкава даследуецца пераважна ў зместавым аспекце (дысертацыйныя даследаванні І. Д. Воюш [1], В. М. Кавальчук [2], В. І. Радкевіч [3], Е. П. Сіняк [4], Л. Д. Сіньковай [5]). Гісторыі стварэння аповесці «Знак бяды» прысвечаны артыкул С. Шапрана [6]; аповесць аналізуецца ў крытычных матэрыялах А. Адамовіча [7], І. Дзядкова [8], артыкулах Л. Д. Корань [9], З. П. Мельнікавай [10], І. В. Патапчук [11]. Фармальныя асаблівасці твора даследаваныя недастаткова, што абмяжоўвае інтэрпрэтацыю сэнсу аповесці.

Структуралізм у тэорыі літаратуры сфарміраваўся пад уплывам структурнай лінгвістыкі. Французскі лінгвіст Ф. дэ Сасюр вылучае сістэмнасць у якасці адной з характарыстык моўнага знака, што азначае магчымасць набыцця значэння толькі пры суаднясенні дадзенага знака з іншымі знакамі сістэмы. Сістэмнасць з'яўляецца ўласцівасцю не толькі знакаў, але і мовы ў цэлым: адзінкі мовы набываюць сэнс дзякуючы ўключэнню ў сістэму, а сістэма можа быць прааналізаваная на падставе разгляду яе структуры і сувязей паміж элементамі [12, с. 117]. У. Проп праводзіць разбор казкі, вылучаючы функцыянальныя элементы структуры [13]; К. Леві-Строс пераносіць моваведчыя ідэі на аналіз міфаў, раскладаючы міф на структурныя адзінкі і выяўляючы іх значэнні [14].

Адным з варыянтаў увасаблення ідэі сістэмнасці пры даследаванні літаратурных тэкстаў з'яўляецца выкарыстанне бінарных апазіцый – антытэтычных паняццяў, сэнс кожнага складніка якіх раскрываецца адносна супрацьлеглага, аднačасова выяўляючы значэнне апазіцыі ў цэлым. В. Шклоўскі пры разглядзе рамана «Вайна і мір» карыстаецца парнымі супрацьпастаўленнямі для аналізу сістэмы персанажаў [15, с. 82]; канцэпцыя дыялагічнасці М. Бахціна палягае ў антытэзе розных моў у рамане, супрацьпастаўленні аўтарскага маўлення іншым мовам разнамоўя [16, с. 149].

У рамках структурна-семіятычнага падыходу Ю. Лотман падкрэслівае сістэмнасць формы і значэння як асноўную ўласцівасць знака, што мае прамое дачыненне да другасных знакавых сістэм, да якіх даследчык адносіць літаратуру [17, с. 47–48]. Кампаненты бінарных апазіцый разглядаюцца як варыянты архізначэння, якое выступае сэнсам апазіцыі ў цэлым. Пры гэтым значэнне фарміруецца пры ўключэнні бінарнай структуры ў кантэкст іншых

апазіцый, што стварае шматузроўневую мадэль аналізу сэнсаў акрэсленых структур у рамках мастацкага тэксту [17, с. 51].

Раскрыццё канцэпцыі жыцця і смерці ў аповесці «Знак бяды» ў рамках структурна-семіятычнага метаду пры дапамозе бінарных апазіцый дазваляе выявіць істотныя для твора сэнсы ў непасрэднай сувязі з яго фармальнымі характарыстыкамі. У аповесці «Знак бяды» апазіцыя жыцця і смерці раскрываецца на некалькіх узроўнях: сюжэтным, часавым, прасторавым.

Гісторыя ў аповесці ахоплівае час ад маладосці галоўных герояў да іх гібелі ў сталым веку падчас вайны. У маладосці Пятрок і Сцепаніда думаюць пра будучыню, маюць шмат спадзяванняў: «Яна проста гатова была скакаць ад радасці – гэта ж падумаць: яны займеюць сваю зямлю, і без грошай, без сваркі, без судоў і прашэнняў – атрымаюць, і ўсё» [18, с. 151]. Рэакцыя на цяжкасці і няўдачы аптымістычная: «Сцепаніда ж пасля няўдач у гэтай зацятай барацьбе з зямлёй за жыццё сказала сабе: не, так не забагацееш, толькі надарвеш здароўе і раней часу сыдзеш у глей на вясковых могілках. Калгас дык калгас, сказала яна сабе, як бы там ні было, мабыць, горш не будзе» [18, с. 141].

Ад будучыні Сцепаніда чакае паляпшэння сітуацыі, прычым яе матывацыя як пры атрыманні зямлі, так і пры ўступленні ў калгас палягае ў клопаце пра сям'ю. Абое герояў занятыя справамі, арыентаванымі на тое, каб пражыць і забяспечыць сябе надалей: Пятрок шмат працуе, Сцепаніда, акрамя працы, вучыцца грамаце. Далей, калі арыштоўваюць Лявона, Сцепаніда шукае выйсця праз дзеянне, намагаецца памяняць сітуацыю ў лепшы бок.

Усе названыя элементы гісторыі выводзяць герояў уцягнутымі ў жыццё, якое ўяўляецца як працэс, у якім неабходна ўдзельнічаць, прымаць рашэнні. Жыццё, успрынятае працэсуальна, ставіць акцэнт на цяперашнім як крыніцы будучага, калі актуальная сітуацыя разумеецца як дадзенасць, зыходны пункт для далейшых дзеянняў.

Падчас вайны героі большую частку часу або занятыя справамі, даручанымі іншымі, або разважаюць пра сваё становішча. Развагі ўтрымліваюць шматлікія згадкі мінулага – ад эпізадычных успамінаў да развітых рэтраспекцый. Пасіўнасць Петрака кантрастуе з яго вобразам у мінулым, Сцепаніда застаецца больш актыўнай, аднак яе дзеянні зводзяцца да асобных рэакцый, якія, да таго ж, нярэдка пагаршаюць сітуацыю (эпізоды з забойствам каровы [18, с. 86–89], знішчэннем вінтоўкі [18, с. 100–101]).

Ключавым пытаннем, якім задаюцца героі падчас вайны, выступае пытанне «за што?», якое мае ў аповесці цэлы шэраг імплікацый. На ўзроўні сюжэта такое пытанне ўводзіць погляд на жыццё як на вынік, уздымаючы праблему лёсу. Канкрэтны момант успрымаецца як зыходны пункт не для планаў на будучыню, а для рэфлексіі з нагоды мінулага: лёс як наяўная сітуацыя патрабуе тлумачэння, што вымагае звароту да пражытага. Будучыня для герояў ператвараецца ў невядомасць, абсяг іх клопату пра далейшае жыццё абмяжоўваецца вайной: «"Што будзе? Чаго чакаць ад немцаў? Дзе нашы, і калі настане канец гэтай калатнечы?" – паныла думаў Пятрок» [18, с. 17].

Сюжэт, які змяняе храналогію гісторыі, паказваючы мінулае рэтраспектыўна, раскрывае разуменне жыцця і лёсу: жыццё пражываецца як працэс і набывае форму лёсу толькі ў выніку далейшай рэфлексіі. Досвед змяняе ступень ведання і разумення, надае пэўнай частцы жыцця завершанасць, у выніку чаго змяняецца ацэнка мінулага і ўзнікае сама патрэба такую ацэнку сфарміраваць. Калі пражытае пачынае ўспрымацца як лёс, героі звяртаюцца да рэфлексіі.

Паказальна, што ва ўспаміны трапляюць тыя моманты мінулага, дзе героі актыўна дзейнічаюць. Для Сцепаніды згадка ўласных актыўных дзеянняў, па-першае, выглядае заканамерна на фоне абмежаванай свабоды падчас вайны і, па-другое, мадэлюе працэс рэфлексіі. Так, пошук прычын разбурэння патрабуе аналізу менавіта дзеянняў – учынкаў, рашэнняў, бо ў іх рэалізуецца кантроль чалавека над сваім жыццём і ўплыў на ход падзей.

Важна падкрэсліць, што разуменне чалавечага досведу выводзіцца ў аповесці праз узаемасувязь жыцця і лёсу: без працэсуальнага досведу немагчымы аналіз выніку, а без пазнейшай пераацэнкі жыццё для чалавека не набывае сэнсу. Такі акцэнт падмацоўваецца экспазіцыяй твора, якая маніфестуе рэфлексію над мінулым як стваральны прыём тэксту: мінулае ператвараецца ў знак, дзе пражытае складае змест, а форма надаецца асэнсаваннем.

Час і прастора ў літаратурным творы акрэсліваюцца праз паняцце хранатопу. Паводле М. Бахціна, мастацкі хранатоп характарызуецца зліццём прасторавых і часавых прыкмет, пры якім час «згушчаецца», набываючы адчувальнасць прасторы, а прастора «інтэнсіфікуецца», апынаючыся інтэграванай у рух часу. Акрамя таго, даследчык адзначае цэнтральную ролю хранатопу ў фармаванні вобраза чалавека ў літаратуры [16, с. 235]. Прасторавая і часавая арганізацыя аповесці «Знак бяды» працуюць на раскрыццё апазіцыі жыцця і смерці.

Адной з ключавых прасторавых характарыстык тэксту выступае лакалізаванасць, засяроджанасць дзеяння на хутары і ў яго ваколіцах. Адасобленасць ад наваколля ўспрымаецца як перавага, што гарантуе спакой, тады

як сувязь са знешнім светам становіцца крыніцай пакут. Вылучэнне хутара ў якасці цэнтра падзей актуалізуе апазіцыю ўнутранай і знешняй прасторы, лакальнага і глабальнага жыцця, мікра- і макрасвету: «Сцепаніда зусім апанурылася – тое, чаго яна найболей баялася, праўдзілася. Яхімоўшчына ад іх не ўбераглася. Што цяпер будзе?» [18, с. 53]. Для Сцепаніды найгоршае – прыход бяды дадому, разбурэнне мікрасвету.

Пятрок, думаючы пра вайну, супастаўляе свет і вёску: «“Божа, Божа, – думаў Пятрок, пазіраючы на мігатлівую мітусню агняных языкоў у вогнішчы, – што робіцца на свеце! Якая страшная вайна, як няўдала пачалася, што будзе далей? Страшны час!” Хоць і да вайны хапала рознага ў вёсцы...» [18, с. 224]. Такое супастаўленне паказвае асаблівасці досведу герояў аповесці: яны мала ведаюць пра свет, бо жылі ў адных мясцінах усё жыццё, таму высновы пра глабальную сітуацыю робяць на аснове лакальных назіранняў. Агульныя ўмовы жыцця розных людзей робяць магчымай экстрапаляцыю ўласнага вопыту, ператвараючы перажытае героямі ў нацыянальны і, шырэй, агульначалавечы досвед. Пры гэтым прывязка да канкрэтных, лакальных праблем пакідае сувязь з непасрэдным досведам, захоўваючы псіхалагічны, чалавечы бок праблемы.

Межы прасторы, азначанай як мікрасвет, акрэсліваюцца ў аповесці як сядзіба, хутар Яхімоўшчына і яго наваколле, вёска Выселкі, мястэчка. Героі аповесці з’яднаныя агульнай прасторай: кожны з сялян, хто атрымаў зямлю «па праве экспрапрыяцыі», зрабіў той самы выбар, што і Пятрок са Сцепанідай, – досвед галоўных герояў распаўсюджваецца на ўсіх насельнікаў мікрасвету. Тым не менш, Пятрок са Сцепанідай знаходзяцца ў самым цэнтры – на сядзібе і ў доме Яхімоўскага (яны так і не збудавалі сваёй хаты). У тэксце аповесці назва хутара неаднаразова падаецца як «яе, яго, свая» Яхімоўшчына [18, с. 11, 43, 177], што падкрэслівае разуменне гэтай прасторы як уласнай.

Значнасць прасторы ў жыцці герояў акцэнтуецца ў наступным фрагменце: «Каб яны ведалі, што іх чакае на хутары, дык, мабыць, уцяклі б ад яго куды далей, можа б, і не вярнуліся на яго» [18, с. 158]. На мікраўзроўні хутар звязваецца з бядой, разбурэннем, гібеллю, якія напаткалі герояў у іх дома. Паказальна, што ўцёкі бачацца як паратунак, хаця ніякай гарантыі на лепшы лёс у іншым месцы няма. На макраўзроўні ў гэтым раскрываецца лакалізаванасць уяўлення пра жыццё і лёс, яго прывязанасць да канкрэтнага месца: менавіта гэты «Богам забыты хутар», гэтая «клятая людзьмі і Богам зямля» становяцца цэнтрам – не героі, не падзеі, а месца.

Наяўнасць падзелу на мікра- і макрасвет актуалізуе апазіцыю «свой – чужы». У кантэксце разумення жыцця і смерці дадзенае супрацьпастаўленне ілюструе, як чалавек рэагуе на ключавыя экзістэнцыйныя выклікі ў залежнасці ад таго, перад кім яны паўстаюць. «Свая» смерць можа быць зразуметая, з аднаго боку, як смерць уласная і, з іншага боку, як смерць «свайго» чалавека.

Першы варыянт выяўлены праз рэакцыю Петрака, калі яго пагражаюць забіць: «Каб не ўпасці, Пятрок у поўнай знямозе прыціснуўся плячмі да шархоткіх газет якраз у тым месцы, дзе ўжо чарнеліся радком тры дзіркі ад куль. “Божа, за што?”» [18, с. 241]. Страх, крыўда, роспач – перажыванні, якія звязваюцца з уласнай смерцю. У той жа час у творы паказана дынаміка ў стаўленні герояў да ўласнай смерці: «Чорт яе бяры, тую смерць, ён [Пятрок] перастаў ужо баяцца яе, білі б толькі хутчэй» [18, с. 243]. Сутыкнуўшыся з пагрозай уласнаму жыццю, героі глядзяць на смерць як на заканамерны вынік сітуацыі, пагаршэнне жыцця апраўдвае ў іх вачах смерць як пазбаўленне пакут. Тым не менш, прыняцце ўласнай гібелі не адмаўляе абурэння ў момант непасрэднай пагрозы [18, с. 249–252], як не адмаўляе і пошуку апошняга супакаення ў разуменні, што ўласныя дзеянні мелі нейкі сэнс [18, с. 318–319].

Прыкладамі рэакцыі на смерць «свайго» з’яўляюцца моманты забойства Янкі, арышту Лявона, знікнення Петрака. Перажыванні Сцепаніды акрэслены наступным чынам: «Сцепаніда не магла пазбыцца горкага адчування свайго дачынення да яго [Янкі] смерці, хоць і разумела: тое, што яна зрабіла з іхняй вінтоўкай, не тычылася болей нікога, нават Петрака, і яна не бачыла тут жаднай сувязі з Янкам» [18, с. 212]. Пачуццё віны, якому няма рацыянальнага тлумачэння, – тое, што прымушае востра перажываць трагедыю і звяртацца да мінулага ў пошуку прычын, суцяшэння і адказу на пытанне «за што?».

Розніца ў стаўленні да смерці «сваіх» і «чужых» ілюструецца думкамі Сцепаніды з нагоды раскулачвання: «Хай раскулачваюць, хай вывозяць з вёскі гэтага зверыядаўца [Гужа], каб яго і духу тут не было. Без яго тут будзе спакойней. Але ж за што іншых?» [18, с. 183]. Падзеі часоў калектывізацыі выводзяць асабістую непрыязь паміж героямі на ўзровень жыцця і смерці, што актуалізуе маральную дылему, сфармуляваную Сцепанідай у іншым фрагменце: «…хіба за такое можна караць?» [18, с. 185]. Сэнс апазіцыі «свой – чужы» ў аповесці «Знак бяды» не абмяжоўваецца названымі аспектамі, аднак менавіта ў праблеме жыцця і смерці дадзены падзел выяўляецца найбольш востра.

Яшчэ адным сэнсавым складнікам акрэсленай прасторавай арганізацыі аповесці з’яў-

ляецца перадача адносін чалавека і свету. Пад светам тут маецца на ўвазе не толькі глабальная сітуацыя, пра якую было згадана вышэй, але і прырода. Героі аповесці – сяляне, таму яны наўпрост залежаць ад прыродных умоў, якія задаюць рамкі іх існавання. Найбольш яркім выяўленнем адносін з прыродай выступае стаўленне Петрака і Сцепаніды да зямлі, якая традыцыйна ўспрымаецца як галоўная ўмова шчасця, дае надзею на лепшую будучыню [18, с. 151]. У той жа час для роду Яхімоўскіх паступовая страта земляў маркіруе заняпад [18, с. 150], а перадача апошняга хутара Петраку і Сцепанідзе прыводзіць да гібелі самога пана, пазбаўляючы яго жыццё сэнсу [18, с. 159].

Прасторавая арганізацыя тэксту непарыўна звязана з часавай. Час найперш успрымаецца храналагічна, як лінейная паслядоўнасць падзей, рух ад нараджэння да смерці. У аповесці час не толькі выступае мерай для падзей, але набывае ўнутраны сэнс, які можна раскрыць пры дапамозе апазіцыі лінейнасці і цыклічнасці. У дадзеным артыкуле пад часам маецца на ўвазе асабісты час, хаця твор падае таксама канцэпцыю гістарычнага часу, што патрабуе асобнага аналізу.

Лінейны час выяўляецца ў жыццёвым шляху герояў. Пятрок і Сцепаніда – людзі сталага веку. Змены ў стаўленні да жыцця, будучыні, акрэсленыя вышэй, адпавядаюць узросту герояў: чым больш сталымі яны становяцца, тым часцей звяртаюцца да перажытага, бліжэй падыходзяць да смерці. На лінейнасць працуе і пачатак твора – карціна разбурэння, аддаленага мінулага, дзе час падаецца як знішчальная сіла [18, с. 5–6]. Пры гэтым якраз смерць і пустка, выведзеныя ў экспазіцыі, становяцца нагодай для вяртання ў часе і апеляцыі да «непадуладнай часу, цярплівай і негаваркой чалавечай памяці» [18, с. 6]. Тое самае адбываецца на ўзроўні сюжэта: рэтраспектыўным устаўкам у аповесці папярэднічае трагедыя, смерць каго-небудзь з герояў. Смерць як канчатковая кропка лінейнага часу ператвараецца такім чынам у зыходную кропку часу цыклічнага.

Вышэй было згадана пра шчыльную сувязь сялян і прыроды, што мае непасрэднае дачыненне да часу, бо цыклічныя змены ў прыродзе якраз задаюць рытм жыцця герояў. Цыклічная канцэпцыя часу характэрна для міфалагічнага светаўспрымання, якое вынікае з назірання за навакольным светам і абагульнення яго законаў у даступнай для чалавека форме. Цыклічны час – час свету, а не чалавека, час, які абстрагуе паняцці жыцця і смерці ад іх лінейнага ўспрымання ў рамках чалавечага жыцця.

Пятрок і Сцепаніда, працуючы на зямлі, шчыльна звязаны з прыродай, да таго ж, іх светапогляду ўласціва пэўная забабоннасць – вера ў знакі (што адсылае да пытання лёсу, наканавання і пошуку сэнсу жыцця ва ўласным мінулым). Закальцаванасць часу, аднак, выяўленая ў аповесці і на больш глыбокім узроўні. Жыццё і смерць у межах цыклічнага часу ператвараюцца ў элементы аднаго бясконцага працэсу, прыроднага кругазвароту. Адбываецца змяшчэнне акцэнтаў – жыццю і смерці надаецца менш вагі, бо сціраецца іх унікальнасць. Прыняцце героямі ўласнай гібелі, праілюстраванае цытатамі вышэй, выяўляе рух у бок пераацэнкі ўласнага жыцця, разумення яго малой значнасці ў глабальным кантэксце разбурэння да і падчас вайны.

Тым не менш, смерць застаецца крытычным момантам. Сцепаніда ў апошнія хвіліны жыцця шукае сэнсу ва ўласным жыцці: «… а можа, і добра, што яе ніхто не пабачыў, ні добры, ні злы чалавек, і ніхто нічога не ўведае. Добрым людзям і не трэба, а гэтыя хай шалеюць. Хай думаюць – дзе? І не спяць ні ўдзень ні ўначы – баяцца да скону» [18, с. 318–319]. Перад смерцю будучыня апынаецца сціснутай да некалькіх імгненняў, што прыводзіць і да сціскання мінулага: ува ўсім, што пражыла Сцепаніда, значэнне мае толькі адзін момант, увесь сэнс жыцця зводзіцца да разумення, што гэты сэнс у ім быў.

Дзякуючы спалучэнню лінейнага і цыклічнага часу ў творы выводзіцца працэс асэнсавання чалавекам тэмпаральнасці ўласнага жыцця, прычым супярэчлівасць поглядаў на жыццё і смерць у рамках дзвюх канцэпцый падкрэслівае складанасць названага працэсу і глыбіню звязанага з ім экзістэнцыйнага канфлікту.

Такім чынам, разуменне жыцця і смерці з'яўляецца складнікам агульнай канцэпцыі чалавека, сфармаванай у творы. Канцэпцыя жыцця і смерці ў аповесці «Знак бяды» характарызуецца наступным чынам: а) пазітыўны погляд на жыццё, чаканні ад будучыні адпавядаюць працэсуальнаму ўспрыманню жыцця, тады як асэнсаванне ўласнага лёсу звязваецца з рэтраспектыўнай рэфлексіяй, якая адбываецца на часавай дыстанцыі; б) разуменне жыцця і смерці мае прасторавы складнік, выяўлены ў супрацьпастаўленні мікра- і макрасвету, рэалізаваным праз узаемадзеянне чалавека і прыроды, апазіцыю «свой – чужы»; в) тэмпаральны складнік у разуменні жыцця і смерці раскрываецца праз спалучэнне лінейнай і цыклічнай канцэпцый часу, выяўленых адпаведна праз канфлікт канчатковасці, непаўторнасці жыцця з пазіцыі чалавека і закальцаванасці, трывіяльнасці жыццяў з пазіцыі быцця.

### Літаратура


1. *Воюш, І. Д.* Трансфармацыя вобраза жанчыны ў беларускай прозе XX стагоддзя: дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / І. Д. Воюш. – Мн., 2004. – 111 л.
2. *Кавальчук, В. М.* Сюжэталогія беларускай і польскай антываеннай прозы: (А. Адамовіч, В. Быкаў, Т. Новак, Т. Бароўскі): дыс. … канд. філал. навук : 10.01.08 / В. М. Кавальчук. – Брэст, 2014. – 160 л.
3. *Радкевіч, В. І.* Інтэртэкст у творах Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча і Віктара Казько: тыпы і функцыянаванне: дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01 / В. І. Радкевіч. – Мн., 2019. – 123 л.
4. *Синяк, Е. П.* Специфика художественного воплощения образа солдата Второй мировой войны в произведениях В. Быкова, И. Шамякина, Г. Белля, Ф. Фюмана : дис. … канд. филол. наук: 10.01.01, 10.01.03 / Е. П. Синяк. – Мінск, 2022. – 142 л.
5. *Сінькова, Л. Д.* Беларуская проза XX стагоддзя: дынаміка жанравых структур: дыс. … д-ра філал. навук: 10.01.01 / Л. Д. Сінькова. – Мінск, 1996.
6. *Шапран, С.* На сямі вятрах: да гісторыі стварэння і першых публікацый аповесці «Знак бяды» Васіля Быкава / С. Шапран // Роднае слова : штомесячны навуковы і метадычны часопіс / заснавальнікі: Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». – 2009. – № 6. – С. 3–9.
7. *Адамович, А.* Из «зеленой тетради» / А. Адамович // Вопросы литературы. – 2001. – № 4. – С. 259–289.
8. *Дзядкоў, І.* Неастылы попел старога пажарышча / І. Дзядкоў // ЛіМ. – 1982.
9. *Корань, Л. Д.* Аб некаторых асаблівасцях псіхалагізму аповесці В. Быкава «Знак бяды» / Л. Д. Корань // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія. – Мн. : Універсітэцкае. – 1984. – № 3. – С. 3–6.
10. *Мельнікава, З. П.* Супрацьстаянне дабра і зла: тыпалогія герояў аповесці В. Быкава «Знак бяды» / З. П. Мельнікава // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зборнік навуковых прац / рэдкалегія: А. С. Садоўская (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Гродна, 2019. – С. 79–86.
11. *Патапчук, І. В.* Асэнсаванне беларускага народнага характару ў аповесці В. Быкава «Знак бяды»: Сцепаніда і Пятрок Багацькі / І. В. Патапчук // Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове : зборнік навуковых артыкулаў : [матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 21 лютага 2020 г. / рэдкалегія: С. Ф. Бут-Гусаім, Л. В. Леванцэвіч, Т. А. Кісель]. – Брэст, 2020. – С. 181–185.
12. *Соссюр, Ф.* Курс общей лингвистики / Редакция Ш. Балли и А. Сеше; Пер. с франц. А. Сухотина / Ф. Соссюр. – Екатеринбург: Изд-во Урал. ун-та, 1999. – 432 с.
13. *Пропп, В.* Морфология волшебной сказки / В. Пропп. – СПб. : Питер, 2021. – 253 с.
14. *Леви-Строс, К.* Структурная антропология / К. Леви-Строс. – М. : Наука, 1983. – 536 с.
15. *Шкловский, В.* О теории прозы / В. Шкловский. – М. : Федерация, 1929. – 265 с.
16. *Бахтин, М.* Вопросы литературы и эстетики / М. Бахтин. – М. : Художественная литература, 1975. – 504 с.
17. *Лотман, Ю.* Структура художественного текста / Ю. Лотман. – М. : Искусство, 1970. – 384 с.
18. *Быкаў, В.* Знак бяды / В. Быкаў. – Мінск : Папуры, 2022. – 320 с.


### References


1. *Voyush, I. D.* Transfarmatsyiya vobraza zhanchyinyi ŭ byelaruskay prozye XX stahoddzya: dyis. … kand. philal. navuk : 10.01.01 / I. D. Voyush. – Mn., 2004. – 111 l.
2. *Kavalchuk, V. M.* Syuzhetalohiya byelaruskay i polskay antyivayennay prozyi: (A. Adamovich, B. Byikaŭ, T. Novak, T. Baroŭski): dyis. … kand. philal. navuk : 10.01.08 / V. M. Kavalchuk. – Brest, 2014. – 160 l.
3. *Radkyevich, V. I.* Intertekst u tvorah Vasilya Byikava, Uladzimira Karatkyevicha i Viktara Kazko: tyipyi i funktsyiyanavannye: dyis. … kand. philal. navuk : 10.01.01 / V. I. Radkyevich. – Mn., 2019. – 123 l.
4. *Sinyak, Ye. P.* Spyetsyifika hudozhyestvyennogo voploshchyeniya obraza soldata Vtoroy mirovoy voynyi v proizvyedyeniyah V. Byikova, I. Shamyakina, H. Böllya, F. Fühmanna : dis. … kand. philol. nauk: 10.01.01, 10.01.03 / Ye. P. Sinyak. – Minsk, 2022. – 142 l.
5. *Sinkova, L. D.* Byelaruskaya proza XX stahoddzya: dyinamika zhanravyih struktur: dyis. … kand. philal. navuk: 10.01.01 / L. D. Sinkova. – Minsk, 1996.
6. *Shapran, S.* Na syami vyatrah : da historyii stvarennya i pyershyih publikatsyiy apovyestsi «Znak byadyi» Vasilya Byikava / S. Shapran // Rodnaye slova : shtomyesyachnyi navukovyi i myetadyichnyi chasopis / zasnavalniki: Ministerstva adukatsyii Respubliki Byelarus, HA «Sayuz pismyennikaŭ Byelarusi». – 2009. – № 6. – S. 3–9.
7. *Adamovich, A.* Iz «zyelyenoy tyetradi» / A. Adamovich // Voprosy lityeraturyi. – 2001. – № 4. – S. 259–289.
8. *Dzyadkoŭ, I.* Nyeastyilyi popyel staroha pazharyishcha / I. Dzyadkoŭ // LiM. – 1982.
9. *Koran, L. D.* Ab nyekatoryih asablivastsyah psihalahizmu apovyestsi V. Byikava «Znak byadyi» / L. D. Koran // Vyesnik Byelaruskaha dzyarzhaŭnaha ŭnivyersityeta imya U. I. Lyenina. Syeryiya 4, Philalohiya. Zhurnalistyika. Pyedahohika. Psihalohiya. – Mn. : Univyersitetskaye. – 1984. – № 3. – S. 3–6.
10. *Myelnikava, Z. P.* Supratsstayannye dabra i zla: tyipalohia hyeroyaŭ apovyestsi V. Byikava «Znak byadyi» / Z. P. Myelnikava // Respublikanskiya Kupalaŭskiya chyitanni : zbornik navukovyih prats / redkalyehiya: A. S. Sadoŭskaya (haloŭnyi redaktar) [i insh.]. – Hrodna, 2019. – S. 79–86.
11. *Patapchuk, I. V.* Asensavannye byelaruskaha narodnaha haraktaru ŭ apovyestsi V. Byikava «Znak byadyi»: Stsyepanida i Pyatrok Bahatski / I. V. Patapchuk // Natsyiyanalna-kulturnyi kampanyent u litaraturnay i dyiyalyektnay movye: zbornik navukovyih artyikulaŭ : [materyiyalyi Resbublikanskay navukova-praktyichnay kanfyerentsyii, Brest, 21 lyutaha 2020 h. / redkalyehiya: S. F. But-Husaim, L. V. Lyevantsevich, T. A. Kisyel]. – Brest, 2020. – S. 181–185.
12. *Saussure, F.* Kurs obshchyey lingvistiki / Ryedaktsyya Sh. Balli i A. Syeshe; Pyer. s frants. A. Suhotsina / F. Saussure. – Yekatyerinburg: Izd-vo Ural. un-ta, 1999. – 432 s.
13. *Propp, V.* Morfologiya volshyebnoy skazki / V. Propp. – SPb. : Pityer, 2021. – 253 s.
14. *Lévi-Strauss, C.* Strukturnaya antropologiya / C. Lévi-Strauss. – M. : Nauka, 1983. – 536 s.
15. *Shklovskiy, V.* O tyeorii prozyi / V. Shklovskiy. – M. : Fyedyeratsyiya, 1929. – 265 s.
16. *Bahtin, M.* Voprosyi lityeraturyi i estetiki / M. Bahtin. – M. : Hudozhyestvyennaya lityeratura, 1975. – 504 s.
17. *Lotman, Yu.* Struktura hudozhyestvyennogo tyeksta / Yu. Lotman. – M. : Iskusstvo, 1970. – 384 s.
18. *Byikaŭ, V.* Znak byadyi / V. Byikaŭ. – Minsk : Papuryi, 2022. – 320 s.


ВЫДРУК